# ЛЯЛЬКО ДЗМІТРЫЙ ІВАНАВІЧ



Паэт, кампазітар, спявак, мастак. Нарадзіўся 22.05.1971г. ў г.п.Воранава. Скончыў Воранаўскую сярэднюю школу (1988), Мірскае вучылішча рэстаўрацыйна-мастацкіх работ (з адзнакай, 1992). Атрымаў спецыяльнасць рэзчыка-сталяра-інструктара. Працаваў настаўнікам у сельскай школе (з 1993), у рэстаўрацыйных майстэрнях за мяжой (з 1996). У 1999-2001 гг. мастак Воранаўскага РДК. Зараз працуе кіраўніком гуртковай работы ў Воранаўскім ГПТВ-190. Дз.І.Лялько – лаўрэат Усесаюзнага рок-фестывалю ў Маскве (1989), абласных і рэспубліканскіх фестываляў бардаўскай песні (1999), абласных фестываляў патрыятычнай песні “Песні нашых сэрцаў” у Гродне (2000-01), фестываля, прысвечанага 60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (2004) і інш. Аўтар карцін на біблейскія тэмы (“Апакаліпсіс”, 1996; “Майсей”, “Выпрабаванне грахом жанчыны-дзявіцы”, абедзве 1999; “Узнясенне на нябёсы господа нашага Іісуса Хрыста”, 2003 і інш.) нацюрмортаў (“Белыя калы”, “Ружы”, “Нацюрморт з нарцысамі ў сіняй вадзе”, усе 2003), пейзажаў (“Восень”, “Вясна”, абодва 2001). Піша вершы. Займаецца разьбой: вырабляе скульптуры, статуэткі, мэблю (“Напольны гадзіннік”, “Бюро”, усе 1997; “Галава вікінга”, 1998; “Шахматы”, 2000).

**Бібліяграфія:**

1.Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Воранаўскага раёна / рэд.кал.: Г.П.Пашкоў (гал. Рэд.) і інш.; маст. Э.Э.Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 2004. – С. 497.